28. Современные дирижеры / сост.: Л. Григорьев, Я. Платек. – М. : Сов. композитор, 1969. – 323 с.
29. Хайкин Б. Беседы о дирижерском ремесле / Б. Хайкин. – М. : Сов. композитор, 1984. – 264 с.

# АНАЛІЗ РАЗВІЦЦЯ ДАКУМЕНТНАГА ПАТОКУ Ў ГАЛІНЕ БЕЛАРУСКАГА ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА Ў 2000–2004 ГГ.

***Раманава Жана Леанідаўна,*** *выкладчык кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнга універсітэта культуры і мастацтваў*

Дакументны паток у галіне беларускага літаратуразнаўства (далей – ДП БЛ) уяўляе з сябе сістэму кампанентаў, узаемазвязаных паміж сабой рознымі прыметамі – тэмай, аўтарствам, відам, жанрам, мовай, выдавецкай установай, месцам выдання і іншымі. Кожная з іх выкарыстоўваецца для бібліяграфічнага пошуку – выяўлення публікацый па тэме, артыкулаў аднаго аўтара, дакументаў пэўнага віда, жанру, мовы, выдавецкай установы і інш. [1, с. 43]. ДП БЛ з’яўляецца крыніцай ведаў аб творах і з’явах беларускай літаратуры, якая непарыўна і пастаянна папаўняецца і выступае як сродак для паступовага іх назапашвання і захоўвання. Неабходна вызначыць яго асноўныя характарыстыкі, высветліць узровень дакументнага адлюстравання сучаснага стану беларускага літаратуразнаўства, вылучыць кірункі даследаванняў, якія патрабуюць далейшай распрацоўкі і першаступеннага інфармацыйнага забеспячэння, а таксама ступень бібліяграфічнага аснашчэння галіны літаратуразнаўства і прабелаў у яе бібліяграфічным адлюстраванні. Дзеля гэтага быў прадпрыняты бібліяметрычны аналіз тэматычнай, тыпа-відавой, выдавецкай і моўнай структур ДП БЛ (як найбольш важных для выяўлення параметраў ДП) і аналіз стану бібліяграфічных рэсурсаў дадзенай галіны.

Базай для выяўлення і збору статыстычных дадзеных аб ДП БЛ сталі наступныя бібліяграфічныя дапаможнікі: “Летапіс друку Беларусі”, з яго састаўнымі часткамі “Летапіс аўтарэфератаў дысертацый” і “Летапіс рэцэнзій”, а таксама “Летапіс часопісных артыкулаў” і “Летапіс газетных артыкулаў”; “Реферативный сборник неопубликованных работ: отчёты НИР, ОКР, ОТР, депонированные научные рукописи”. У даследаванні вывучаліся толькі навуковыя, навукова-папулярныя і папулярныя выданні і публікацыі беларускага літаратуразнаўства. Афіцыйныя, даведачныя, навучальныя, рэкламныя



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выданні і публікацыі засталіся па-за межамі нашага даследавання. Пры аналізе ДП БЛ улічваліся асобныя выданні (апублікаваныя і неапублікаваныя), артыкулы з калектыўных і аўтарскіх зборнікаў, з перыядычных выданняў (газет і часопісаў), з выданняў, якія працягваюцца.

Для вывучэння змены інтэнсіўнасці ДП БЛ быў праведзены аналіз яго дынамікі, які паказаў, што за перыяд 2000–2004 гг. аб'ём выданняў і публікацый склаў 5635, альбо 1127 адзінак у сярэднім за год. Найменшая іх колькасць налічваецца ў 2000 г. – 929 адзінак, найбольшая – у 2004 г. – 1164 адзінкі. Трэба адзначыць нестабільную дынаміку патоку – колькасць артыкулаў ад года да года то павялічваецца, то змяншаецца, што можна, напэўна, растлумачыць прычынамі аб'ектыўнага характару, такімі, як, напрыклад, розная ступень фінансавай забяспечанасці галіны ў розныя перыяды часу.

Важным з'яўляецца аналіз тэматычнай структуры патоку, які дазваляе бібліёграфам своечасова вызначаць найбольш актуальныя праблемы літаратуразнаўства для перспектыўнага і бягучага планавання і стварэння праблемна-тэматычных картатэк і паказальнікаў.

Пры вывучэнні тэматычнай структуры ДП БЛ удалося ўстанавіць, што сярод выданняў пальма першынства належыць тэме "Персаналія" – 75 адзінак з 182, ці 41% ад агульнай колькасці апублікаваных выданняў. Гэта не выпадкова і тлумачыцца тым, што для твораў беларускай мастацкай літаратуры натуральным з'яўляецца аўтарскі характар. Асоба аўтара, адметныя рысы яго творчасці, безумоўна, становяцца адным з галоўных аб'ектаў вывучэння і даследавання ў літаратуразнаўстве.

На другім месцы тэма "Паэтыка" – 28 выданняў, ці 15%. У яе межах разглядаюцца праблемы ідэі, тэмы, сюжэта твораў, іх мовы і стылістычных асаблівасцяў, жанраў і відаў.

19 выданняў, ці 10% належаць да тэмы "Гісторыя беларускай літаратуры", што таксама заканамерна, бо гістарычны працэс ніколі не спыняецца, з цягам часу з'яўляюцца новыя факты і звесткі, а гэта патрабуе вывучэння і ўнясення ўдакладненняў у раней створаныя працы.

Тэма "Узаемасувязі і ўзаемаўздзеянне літаратур" прадстаўлена 13 выданнямі і абумоўлена традыцыйна існуючымі сувязямі славянскіх літаратур і актуальнасцю іх вывучэння на дадзеным этапе.

Даследаванню тэорыі літаратуры было прысвечана 10 выданняў, тэме "Літаратурная крытыка" – 7, "Літаратурнае краязнаўства" – 5, "Літаратурная адукацыя" – 4, "Пошук духоўных ідэалаў" – 4, "Літаратура беларускага замежжа" – 3, "Патрыятызм і служэнне Беларусі" – 2 і 12 выданняў было прысвечана іншым тэмам (па адным выданні на кожную тэму).

Аналіз тэматычнай структуры другаснага патоку БЛ дазваляе зрабіць выснову, што яго тэматычная структура ў асноўным адпавядае структуры першаснага патоку: найбольш бібліяграфічна забяспечанымі за перыяд 2000–2003 гг. з'явіліся наступныя тэмы: персаналія



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– 339 адзінак (70%), жанры беларускай літаратуры – 54 адзінкі (11%), гісторыя беларускай літаратуры – 17 адзінак (3,5 %), літаратурныя стылі – 9 (1,9%), мастацкі вобраз – 8 (1,6%), краязнаўства і фальклор – па 6 адзінак, літаратура беларускага замежжа, беларуская літаратура і хрысціянства, узаемасувязі беларускай літаратуры з іншымі – па 5 адзінак, літаратурная крытыка – 4. Астатнія тэмы прадстаўлены 3–1 адзінкамі.

Аналіз тыпа-відавой структуры ДП БЛ дазваляе вызначыць распаўсюджанасць і функцыі ў ім дакументаў розных тыпаў, відаў, жанраў.

Аналіз відаў дакументаў, вылучаных у адпаведнасці з формай выдання, дазволіў зрабіць выснову, што найбольшую колькасць складаюць публікацыі ў газетах, часопісах і выданнях, якія працягваюцца – адпаведна 2976 (53%) і 1715 адзінак (30%). Найменшую – аўтарэфераты дысертацый – 38 (0,7%). Кнігі і брашуры складаюць 144 адзінкі (2,5%), артыкулы з навуковых зборнікаў – 149 (2,6%), рэцэнзіі – 612 (11 %), а такая форма выдання як мастацкія каталогі прадстаўлена толькі адным выданнем.

Аналіз відаў выданняў беларускага літаратуразнаўства па функцыянальна-мэтавым прызначэнні дазваляе характарызаваць дакументы з пункту гледжання грамадскіх функцый, якія яны выконваюць. Ён паказаў, што самую вялікую іх частку складаюць навуковыя выданні – 167 адзінак, навукова-папулярныя – 15 адзінак.

У сваю чаргу навуковыя дакументы падраздзяляюцца на апублікаваныя і неапублікаваныя. Больш за ўсё апублікаваных дакументаў – 167. Неапублікаваных – 19.

Сярод апублікаваных дакументаў найбольш навуковых выданняў манаграфічнага тыпу – 74 (44%). Аўтарэфераты дысертацый прадстаўлены 38 выданнямі (23%), матэрыялы канферэнцый, з'ездаў – 34 (20 %), зборнікі навуковых артыкулаў – 13 (8%), манаграфіі – 5 (3%), тэзісы дакладаў канферэнцый і з'ездаў, выбраныя творы літаратуразнаўцаў, даследаванні і матэрыялы прадстаўлены кожны адным выданнем (2% усе разам). Сярод неапублікаваных дакументаў найбольшую колькасць складаюць дэпанаваныя рукапісы – 12 (63%), справаздач аб НДР у галіне беларускага літаратуразнаўства – 4 (21%), прэпрынтаў – 3 (16%).

Акрамя асобных выданняў да мікрапатоку навуковых выданняў належаць публікацыі ў навуковых часопісах і выданнях, якія працягваюцца, – іх колькасць складае 842 адзінкі, і публікацыі ў навуковых зборніках – 149. Такім чынам, мікрапаток навуковых выданняў і публікацый складае 1161 адзінку, ці 21% ад агульнай колькасці. Перавага навуковых дакументаў, апублікаваных у перыядычных выданнях, а таксама невялікая колькасць справаздач аб НДР – важнай крыніцы навуковай інфармацыі, сведчыць пра павышаную цікавасць аўтараў і чытачоў да праблем беларускага літаратуразнаўства, магчымасць у адносна кароткі тэрмін апублікаваць матэрыялы, але таксама і пра недахоп часу і сродкаў для стварэння і публікацыі буйных выдавец-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кіх форм, напрыклад, манаграфій [2, с. 202].

Самую вялікую долю ў ДП БЛ маюць артыкулы з перыядычных выданняў і выданняў, якія працягваюцца. Так, артыкулы з газет склалі 2976 публікацый. Артыкулы з часопісаў і неперыядычных выданняў – 1715 публікацый. У суме публікацый у перыядычным друку ў 30 разоў больш, чым асобных выданняў. Тлумачыцца гэта тым, што беларускае літаратуразнаўства з'яўляецца навукай, якая цікавіць не толькі вузкае кола прафесіяналаў – пісьменнікаў, літаратуразнаўцаў, выкладчыкаў дысцыплін філалагічнага цыклу і іншых спецыялістаў, але і шырокае кола чытачоў, прафесійна не звязаных з літаратурай, але зацікаўленых яе праблемамі.

Было выяўлена 1715 публікацый у часопісах і выданнях, якія працягваюцца. Артыкулаў з навуковых часопісаў – 842 (49%). Артыкулаў з часопісаў розных напрамкаў і прызначэння – 873 адзінкі (51%). Аналіз патоку часопісаў і выданняў, якія працягваюцца, дазволіў вылучыць сярод іх некалькі груп, што ўключаюць у сябе аднародныя публікацыі: 1) навуковыя часопісы, 2) літаратурна-мастацкія часопісы, 3) грамадска-палітычныя, культуралагічныя, прызначаныя для адпачынку і іншыя часопісы, 4) вытворча-практычныя часопісы, 5) рэлігійныя часопісы, 6) краязнаўчыя і гісторыка-літаратурныя часопісы. Несумненным лідэрам тут з'яўляецца група літаратурна-мастацкіх часопісаў, у якіх знаходзіцца 56% ад агульнай колькасці публікацый. Тлумачыцца гэтае становішча тым, што яны профільныя, галіновыя для беларускага літаратуразнаўства, і таму іх змест поўнасцю складаецца з публікацый, якія належаць да беларускага літаратуразнаўства і мастацкай літаратуры.

Пры вывучэнні з'явы канцэнтрацыі і рассеяння публікацый, якая дазваляе вылучыць ядро і сярэднюю зону канцэнтрацыі тэматычна спецыялізаваных і кола няпрофільных перыядычных выданняў, было вызначана ядро часопісаў, на старонках якіх змяшчаецца найбольшая колькасць артыкулаў, прысвечаных беларускаму літаратуразнаўству. Да іх належаць "Роднае слова" – 469 артыкулаў, "Крыніца" – 161 і "Полымя" – 156.

У сярэднюю зону канцэнтрацыі публікацый па беларускім літаратуразнаўстве ўваходзяць наступныя часопісы: навуковыя – у асноўным гэта часопісы, якія выдаюцца вышэйшымі навучальнымі установамі, акрамя таго, часопісы "Пачатковая школа" і "Спадчына"; літаратурна-мастацкія ("Маладосць" – 97 публікацый, "Неман" – 65, "Arche" – 64); масава-палітычныя і папулярныя часопісы "Першацвет", "Беларусь", "Кантакты і дыялогі", "Алеся"; вытворча-практычны – "Бібліятэка прапануе"; рэлігійны часопіс "Наша вера".

Зона рассеяння публікацый прадстаўлена 68 часопісамі, што змясцілі на сваіх старонках па 1–2 артыкулы за пяць гадоў. Сюды ўваходзяць як навуковыя, так і грамадска-палітычныя, папулярныя, рэлігійныя, гістарычныя і іншыя часопісы, а таксама вытворча-практычныя, тэматыка якіх зусім не звязана з літаратуразнаўствам: "Инженер-механик", "Мир медицины", "Компас экспедитора и пере-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

возчика", "Лесное и охотничье хозяйство" і іншыя. Як бачым, зона рассеяння вельмі вялікая і па колькасці выданняў, і па іх галіновай прыналежнасці, што складае праблемы пры пошуку неабходных звестак і патрабуе стварэння крыніц другаснай інфармацыі для арыентацыі ў патоку.

Падобная карціна назіраецца і з газетнымі публікацыямі літаратуразнаўчай тэматыкі, якія склалі 2976 артыкулаў за разгледжаны перыяд. Сярод 103 газетных выданняў вылучаецца ядро профільных у колькасці 8 газет, на старонках якіх публікуецца амаль палова літаратуразнаўчых матэрыялаў – 49% (1446 артыкулаў за пяць гадоў). Да іх належаць: "ЛіМ" – 576 артыкулаў, "Народная воля" – 144, "Звязда" – 143, "Голас Радзімы" – 129, "Культура" – 122, "Советская Белоруссия" – 119, "Наша слова" – 108, "Настаўніцкая газета" – 105. У гэтых выданнях, акрамя публікацый па праблемах беларускай літаратуры, інтэрв'ю з пісьменнікамі, аглядамі іх творчасці і г.д., публікуюцца і афіцыйныя матэрыялы.

Сярэдняя зона канцэнтрацыі публікацый беларускага літаратуразнаўства прадстаўлена 38 газетамі рознага прызначэння і кірунку, як рэспубліканскімі, так і абласнымі, што змясцілі на сваіх старонках ад 16 да 3 публікацый за пяць гадоў.

У зону рассеяння ўвайшлі выданні, якія апублікавалі ў сярэднім 1–2 артыкулы па беларускім літаратуразнаўстве за пяць гадоў. Усяго іх 57. Яны змясцілі 14% (232) публікацый.

Аналіз выданняў і публікацый беларускага літаратуразнаўства па моўнай структуры дазволіў выявіць наступныя заканамернасці. Сярод 182 апублікаваных выданняў пераважную колькасць складаюць працы на беларускай мове – 135 адзінак, ці 74% ад агульнага ліку. Сярод 19 неапублікаваных дакументаў 18 адзінак існуе на беларускай мове і толькі 1 дакумент – на рускай.

З агульнай колькасці артыкулаў, апублікаваных у часопісах і выданнях, якія працягваюцца, 92% выдадзена на беларускай мове. Першыя пазіцыі па публікацыі беларускамоўных артыкулаў займаюць часопісы "Роднае слова", "Крыніца", "Полымя" і "Маладосць", у якіх усе публікацыі выйшлі на беларускай мове. Прыкладна тая самая сітуацыя і з публікацыямі ў газетах – 78% іх выйшла на беларускай мове.

Аналіз выдавецкай структуры ДП БЛ па беларускім літаратуразнаўстве дазваляе зрабіць выснову, што вядучымі выдавецтвамі Рэспублікі Беларусь у гэтай галіне з'яўляюцца дзяржаўныя. Самыя прадуктыўныя – выдавецтвы БДУ (40 выданняў – 22%) і "Беларуская навука" (32 выданні – 18%). Першае з іх ажыццяўляе выданне матэрыялаў канферэнцый, зборнікаў навуковых артыкулаў і аўтарэфератаў дысертацый. Другое – навуковых выданняў манаграфічнага тыпу, манаграфій, зборнікаў навуковых артыкулаў.

Акрамя таго, навуковыя працы выходзяць у Гродзенскім і Брэсцкім дзяржаўных універсітэтах (13 і 9 выданняў адпаведна), у спецыялізаваных выдавецтвах "Беларускі кнігазбор" (14) і "Мастацкая лі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таратура" (10).

Да ліку ўстаноў, што перыядычна, але недастаткова часта папаўняюць масіў літаратуразнаўчых выданняў, належаць выдавецкія цэнтры такіх вышэйшых устаноў, як Віцебскі, Гомельскі і Магілёўскі дзяржуніверсітэты, Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт. Іншыя выдавецкія ўстановы друкавалі літаратуразнаўчыя выданні з перыядычнасцю 1–2 адзінкі на працягу пяці год.

На падставе вынікаў праведзенага даследавання можна зрабіць наступныя высновы. Самае вялікае месца ў ДП БЛ займаюць артыкулы з перыядычных выданняў і выданняў, якія працягваюцца. Гэта тлумачыцца інтарэсам да мастацкай літаратуры шырокага кола чытачоў і вялікай колькасцю разнастайных часопісаў і газет як профільных, так і агульнамасавых, у якіх існуюць раздзелы з інфармацыяй літаратуразнаўчага характару.

Несумненнай перавагай ДП БЛ з'яўляецца дастатковая колькасць спецыялізаваных часопісных і газетных выданняў высокай прадукцыйнасці, на старонках якіх друкуецца цікавая і сур'ёзная інфармацыя, у тым ліку і навуковая. Такім чынам, спецыялісты азначанай галіны ведаў маюць профільныя выданні і могуць дастаткова аператыўна атрымліваць актуальную і карысную інфармацыю. Але неспакой выклікае вялікая зона рассеяння публікацый у няпрофільных перыядычных выданнях і адсутнасць спецыяльных крыніц другаснай інфармацыі, якія б адлюстроўвалі паток і масіў публікацый. Такое становішча стварае сітуацыю, калі спажыўцы не могуць атрымаць поўную і дакладную інфармацыю аб усіх наяўных матэрыялах, якія ствараюцца ў нетрах літаратуразнаўства.

Вельмі малая колькасць асобных выданняў – усяго 2,5% – выклікае дэфіцыт у навуковай інфармацыі і недастатковую інфармацыйную аснашчанасць галіны. Сітуацыя, якая склалася, сведчыць аб тым, што беларускае літаратуразнаўства на дадзеным этапе дынамічна развіваецца, але, магчыма, па прычынах аб'ектыўных (недастатковасць матэрыяльных сродкаў, што выдзяляюцца на навуку) і суб'ектыўных, не мае магчымасці для выдання вялікай колькасці сур'ёзных прац. Дадзеная выснова пацвярджаецца і адносна невялікай колькасцю навуковых выданняў і публікацый у ДП БЛ. Мікрапаток навуковых выданняў і публікацый складае прыблізна чацвёртую частку ад усяго ДП БЛ і не можа ў дастатковай ступені задаволіць патрабаванні галіны ў фундаментальнай навукаёмістай інфармацыі. Адна з прычын гэтай сітуацыі – невялікая колькасць асобных навуковых выданняў, надрукаваных выдавецкімі цэнтрамі вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі, якія павінны быць флагманамі і рухавікамі навукі.

Для беларускага літаратуразнаўства характэрна тэматычная аднастайнасць. У асноўным даследаванні тычацца жыцця і творчасці беларускіх пісьменнікаў (пераважна класікаў), паэтыкі беларускай літаратуры, яе гісторыі і ўзаемасувязяў з іншымі славянскімі літаратурамі. Распачаты аналіз тэматычнай структуры паказаў, што кірун-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

камі, якія патрабуюць першачарговага інфармацыйнага забеспячэння, з'яўляюцца наступныя: пошук духоўных ідэалаў, літаратурнае краязнаўства, літаратурная адукацыя, літаратура беларускага замежжа, патрыятызм і служэнне Беларусі, акрамя таго, неабходна іх адлюстраванне ў крыніцах другаснай інфармацыі.

Значным і каштоўным для беларускага літаратуразнаўства з'яўляецца тое, што пераважная колькасць яго матэрыялаў публікуецца на беларускай мове. У сярэднім 87% выданняў і публікацый за 2000–2004 гг. выйшла на нацыянальнай мове. Выкарыстанне творчымі людзьмі роднай мовы ў якасці асноўнай пры публікацыі вынікаў вывучэння і даследавання твораў і з'яў беларускай літаратуры, шырокая яе папулярызацыя праз беларускамоўныя публікацыі ў газетах і часопісах дазваляе спадзявацца, што нацыянальная мова не будзе толькі пачэснай госцяй у сваёй краіне, а ператворыцца ў сапраўдную гаспадыню.

На падставе аналіза ДП БЛ і выяўленай неабходнасці існавання сістэмы бібліяграфічнай інфармацыі па беларускім літаратуразнаўстве для арыентацыі карыстальнікаў у першасных дакументах было праведзена даследаванне сучаснага стану азначанай сістэмы і яе кампанентаў. Быў разгледжаны стан навукова-дапаможнай і рэкамендацыйнай бягучай і рэтраспектыўнай бібліяграфіі за 2000–2003 гг.

Аналіз паказаў, што функцыю бягучага навукова-дапаможнага паказальніка па беларускім літаратуразнаўстве выконваюць "Летапіс друку Беларусі", "Летапіс часопісных артыкулаў" і "Летапіс газетных артыкулаў" Кніжнай палаты РБ, а рэкамендацыйнага – "Беларуская мова, літаратура, мастацтва" і "Новыя кнігі: па старонках беларускага друку" Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Але нельга сказаць, што гэтыя выданні забяспечваюць патрэбы ў літаратуразнаўчай інфармацыі. Справа ў тым, што яны выходзяць вельмі малымі тыражамі, напрыклад, тыраж "Летапісу друку Беларусі" вагаецца ад 170 да 200 экзэмпляраў, "Новых кніг: па старонках беларускага друку" – ад 1310 да 2510 экзэмпляраў, а паказальніка "Беларуская мова, літаратура, мастацтва" – каля 120. Калі ўлічыць, што ў Рэспубліцы Беларусь 11 тыс. бібліятэк, то становіцца відавочным, што адзначаныя выданні не могуць забяспечыць бягучае інфармаванне спецыялістаў, навукоўцаў і іншых катэгорый карыстальнікаў. Для выпраўлення сітуацыі павінны існаваць спецыяльныя бягучыя паказальнікі, але іх няма.

Не ў лепшым стане знаходзяцца справы і з рэтраспектыўным бібліяграфічным інфармаваннем. Сістэма адпаведных дапаможнікаў застыла ў сваім развіцці на ўзроўні 80-х гг. XX ст. Не мае працягу буйны паказальнік Н.Б. Ватацы "Беларускае літаратуразнаўства і крытыка (1945–1963)" (Мн., 1964).

У галіне БЛ за 2000–2003 гг. быў выдадзены 481 дапаможнік. Аднак аналіз формы іх выдання паказаў, што асобна выдадзеных дапаможнікаў было ўсяго 5: 4 – навукова-дапаможныя, 1 – рэкамендацыйны. Яны носяць персанальны характар і прысвечаны дзеячам



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларускай літаратуры і літаратуразнаўства, утрымліваюць творы пісьменнікаў і літаратуру пра іх. Астатнія бібліяграфічныя дапаможнікі прадстаўлены несамастойнымі выдавецкімі формамі. 347 адзінак, ці 67%, – у перыядычных выданнях (сярод іх унутрычасопісныя спісы складаюць 3 адзінкі – 0,6%, прыартыкульныя – 328 – 65%, бібліяграфічныя матэрыялы ў падрадковых заўвагах – 16 – 3,1%). Унутрыкніжных бібліяграфічных спісаў – 121, ці 23%. Прыкніжных спісаў – 42 адзінкі, ці 8%. Але не ўсе яны па сваіх якасных і колькасных характарыстыках могуць быць прызнаны паўнавартаснымі бібліяграфічнымі дапаможнікамі і крыніцамі пошуку для вучоных і спецыялістаў, звесткі аб іх можна атрымаць толькі з “Паказальніка бібліяграфічных дапаможнікаў” Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі (тыраж 100 экзэмпляраў). Таму не выклікае сумненняў, што наяўная рэтраспектыўная бібліяграфічная інфармацыя не можа забяспечыць патрэбы карыстальнікаў.

У дрэнным становішчы апынулася рэкамендацыйная ці папулярная бібліяграфія, якая заўсёды была важнай крыніцай інфармацыйнага забеспячэння сферы адукацыі, самаадукацыі і вольнага часу. За перыяд 2000–2003 гг. яна не папоўнілася буйнымі і значнымі паказальнікамі. Асноўнымі яе крыніцамі працягваюць заставацца штогодны паказальнік “Беларуская мова, літаратура, мастацтва” і спісы да паказальніка “Новыя кнігі: па старонках беларускага друку”, якія складаюцца Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі. Хоць менавіта цяпер як ніколі актуальнымі могуць стаць папулярныя бібліяграфічныя паказальнікі, адрасаваныя педагогам, студэнтам, школьнікам. Менавіта яны ставяць мэтай аказаць дапамогу згаданым катэгорыям карыстальнікаў, а таксама шырокім чытацкім колам, у арыентацыі ў дасягненнях і праблемах літаратурнай навукі. На сённяшні час гэтая праблема стаіць надзвычай востра, бо выдадзеныя да 1991 г. рэкамендацыйныя дапаможнікі састарэлі па сваім змесце, не адпавядаюць рэаліям часу і праграмам навучальных устаноў.

Праведзенае даследаванне дазваляе зрабіць выснову, што ў межах бібліяграфічнага аснашчэння галіны літаратуразнаўства надзённым з’яўляецца стварэнне бягучага паказальніка, ў якім бы аператыўна і поўна адлюстроўвалася галіновая інфармацыя.

Актуальная задача – рэтраспектыўны працяг бібліяграфічных дапаможнікаў па літаратуразнаўстве, значнае павелічэнне колькасці самастойных форм бібліяграфічнай інфармацыі, яе тыпа-відавая і жанравая разнастайнасць.

Патрабуе сур’ёзнай увагі падрыхтоўка і выданне рэкамендацыйных дапаможнікаў па актуальных і значных тэмах літаратуразнаўства.

Інакш кажучы, для ўсебаковага задавальняючага інфармавання карыстальнікаў па праблемах і пытаннях беларускага літаратуразнаўства неабходна стварэнне цэласнай актуальнай сістэмы бібліяграфічнай інфармацыі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Гордукалова Г. Ф. Документальный поток социальной тематики как объект библиографической деятельности / Гордукалова Г. Ф. – Л. : ЛГИК, 1990. – 108 с.
2. Зиновьева Н. Б. Документоведение / Зиновьева Н. Б. – М. : Профиздат, 2001. – 207 с. – (Серия "Современная библиотека" ; вып. 17).

# НАСТОЛЬНЫЯ ВЫДАВЕЦКІЯ СІСТЭМЫ – АКТЫЎНЫ ЎДЗЕЛЬНІК ПРАЦЭСУ КНІГАВЫДАННЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

***Арэшка Таццяна Дзмітрыеўна**, выкладчык кафедры інфармацыйных тэхналогій у культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў*

Вытворчасць кніг – гэта той паказнік, які ў вялікай ступені адлюстроўвае змены ў сацыяльнай, эканамічнай і культурнай сферах грамадскага жыцця. Поспехі сучаснай тэхнікі, асабліва ў галіне аўтаматыкі, электронікі і камп'ютараў, рэвалюцыянізавалі друк.

Пераўтварэнні пачаліся ў 50-х гг. мінулага стагоддзя, калі з'явіліся фотанабор і электронны колерападзел. Але поўнасцю магчымасці гэтых новаўвядзенняў разгарнуліся толькі ў 1970-х гг., калі былі створаны відэатэрміналы і электронныя генератары растравых кропак, якія забяспечылі прагляд і карэкціроўку набранага тэксту, дазволілі ствараць паўтоны непасрэдна ў электронных колерападзяляльніках. Гэтыя змены, а таксама з'яўленне мікра-ЭВМ паступова прывялі да таго, што паліграфіяператварылася ў высокатэхналагічную вытворчасць.

Сёння выдавецкая і паліграфічная індустрыя перажывае працэс карэнных пераўтварэнняў. Фактычна адбываецца новая з'ява, што мае вялікае значэнне для грамадства. Друкаваныя сродкі масавай інфармацыі выступаюць сумесна з лічбавымі. Камп'ютарная вытворчасць аблягчае жыццё малатыражных выданняў. Гэта дазваляе ўлічваць патрабаванні арыентаваных на пэўныя запыты чытачоў. Персанальныя камп'ютары сталі асноўным сродкам інтэлектуальнай працы – рэдактарскай і аўтарскай, праектавання, рознага кшталту тэарэтычнага аналізу, планавання, выканання дзелавых аперацый і маркетынгу. Камп'ютарная тэхналогія аб'ядноўвае ў адзінае цэлае розныя бакі паліграфічнай вытворчасці: бухгалтарскі ўлік, уласна вытворчасць, рэдагаванне і рэкламу.

З укараненнем у паліграфію камп'ютарных выдавецкіх сістэм асабліва шырокае ўжыванне ў якасці арыгіналаў атрымалі электрон-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ